Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9. (Wilno, Ostrobramska 9). АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Рукапісы павінны быць напісаны чытальна і толькі на адным баку паперы, з праудзівым прозьвішчам аутара і адрэсам (для ведама Рэдакцыі). Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 30 м.
Падпіска на 3 месяцы каштуе 400 м. (з даст. дахаты)
Цана абвестак: перад тэкстам 150 мк., пасьля тэксту 200 м. і на апошняй страніцы 70 мк. за радок пэтыту у 1 шпальту

Год II. Вільня, Субота, 18 сакавіка 1922 г. № 8 (33)

Ад Цэнтральнае Беларускае Школьнае Рады.

Гэтым даводзіцца да агульнага ведама, што ў распараджэньні Рады знаходзіцца цэлы рад стыпэндыяў у вышэйшых школах Чэха-Славацкай Рэспублікі для беларускае маладзежы з сярэдняй адукацыяй. Беларусы і беларускі, маючыя атэстаты аб сканчэньні сярэдніх школ могуць зьвяртацца да Рады з просьбай аб прызначэньні ім гэтых стыпэндыяў. Да просьбы павінны быць даложаны: дакумэнт аб асьвеце, ці яго нотарыяльная копія і жыцьцярыс — пажадана, каб быў пасьведчаны беларускімі арганізацыямі, ці хаця-б вядомымі дзеячамі. Стыпэндыі перад усім будуць выдавацца асобам, прымаўшым актыўны удзел у нацыянальным жыцьці.

Старшыня Б. Тарашкевіч

Сэкрэтар А. Смоліч

Польска-балтыцкая канфэрэнцыя.

Калі мы паглядзім на карту сучаснай Польшчы, дык нам адразу кінецца ў вочы даволі арыгінальныя наагул формы яе граніц.

Асабліва-ж нязвычайнымі пакажуцца нам знамянітыя „калідоры“: адзін — да Гданску, а другі — пад Полацак.

Тады, як Гданскі калідор дае Польшчы выхад у мора і праходзіць па тэрыторыі больш-менш польскай, калідор пад Полацак і да мора не вядзе і праходзіць па тэрыторыі чыста беларускай, на якой палякі ніколі ня жылі, значыць, па тэрыторыі чужой.

Гэты апошні калідор нарадзіўся на сьвет Божы зусім прыпадкова, пасьля таго, як была падпісана Рыская умова.

Польшча атрымала тады супольную граніцу з Латвіяй, аддзяліўшы Літву ад Расеі і Савецкай Беларусі Полацкім калідорам.

Цяпер Польшча стараецца выкарыстаць Полацкі калідор для Польска-балтыцкага саюзу.

У Варшаве толькі што закончылася Канфэрэнцыя прадстаўнікоў Фінляндзіі, Эстоніі, Латвіі і Польшчы, на якой абгаварыліся палітычныя і эканамічныя стасункі паміж гэтымі гаспадарствамі.

Чым скончаліся перагаворы — ня ведама яшчэ дасканальна, але можна дагадывацца, што Польшча пасьля таго, як Літва катэгорычна адмаўляецца гаварыць з Польшчай пакуль тая не аддасьць Літве Віленшчыны, старалася на апошняй канфэрэнцыі ў Варшаве схіліць балтыцкія дзяржавы да ўтварэньня супольнага фронту проціў бальшавікоў і немцаў.

Ня будзем пакуль што выказываць сваіх адносін да гэтага супольнага фронту і гадаць аб магчымых выніках вайны „саюзьнікаў“ з тымі, проціў каго гэты фронт высоўваецца.

Але, мы павінны безадкладна сьцьвердзіць вось што, вельмі важнае для нас.

Калі-б адбыўся такі саюз Польшчы, Латвіі, Эстоніі і Фінляндзіі, дык гэтым самым значна умацавалася-б палажэньне Польшчы у Віленшчыне, бо тады-б, значыць, на яе абарону разам з Польшчай павінны былі стаць і балтыцкія саюзьнікі Польшчы.

Мы думаем, што бліжэйшая будучыня раскрые перад намі рэзультаты Варшаўскіх польска-балтыцкіх перагавораў і тады мы дамо поўную ацэнку утворанай канфэрэнцыяй сітуацыі.

Ш.

Не запужаеце!

Кожны дзень прыносе ўсё новыя і новыя весткі аб тым, што вычварае з беларускімі сялянамі польская адміністрацыя. Жуду і жах вызываюць гэтыя весткі: ўсё, што рабілі нямецкія гакатысты і маскоўскія ахраншчыкі, — ўсё гэта толькі дзяцінства, раўнуючы да таго, што робіцца на Беларускай зямлі пад уладаю „дэмакратычнае“ Польскае Рэчыпаспалітае...

Гляньма хоць-бы на страніцы нашае газэты—на тое, што пішуць нашы карэспандэнты з вёсак. Кожная карэспандэнцыя—гэта крык скаргі і жальбы на нячуваны зьдзек.

Вось жменя фактаў—толькі з трох нумяроў газэты (5, 7, 8)!

З Гарадзеі пішуць:

У в. Падлесьсі паліцыя арыштавала і крэпка зьбіла пры дапросе сялян Івана Яновіча і Уладзіміра Русака за... чытаньне легальных беларускіх газэт і кніжак. Абодва знаходзяцца ў Нясьвіжскім вастрозе.

У акалічных вёсках зроблены рад вобыскаў у сялян, якія выпісаваюць і чытаюць беларускія легальныя часопісі. За апошні „праступак“ яны аб'яўлены „бальшавікамі“. За гэта-ж самае ў в. Новая Вёска зьбіты да паўсьмерці Зьм. і К. Велянцеі.

У вядомых сваей беларускасьцю сялян робяцца вобыскі пад відам „шуканьня аружжа“. Ведама, ніякага аружжа не знаходзяць, бо яго ні ў каго нямашака. Так было ў 12 хатах у Дольнай Гарадзеі: трэба было „запужаць“ сялян, каб ня сьмелі прызнавацца да сваей беларускасьці...

У самай Гарадзеі камандант паліцыі сваей уласнай рукой б'еці сялян, якія, прыходзячы за пашпартамі, заяўляюць, што яны беларусы. Зьбіты ім, паміж іншым два Паргімовічы, якія пасьля гэтага і пашпартоў зракліся, але не нацыянальнасьці сваей.

У в. Райцы вайсковыя зьбілі сьвяшчэніка, які даходзіў свайго меньня...

У Горадні арыштаваны ўсе вучыцялі беларускае школы, а школа аддадзена пад апеку вучыцеля-паляка...

У Ашмяне арыштаваны кнігар Тарчэўскі, а ўсе беларускія кнігі з яго кнігарні забраны ўладай. Кнігі — ўсе легальныя, ды толькі ў беларускай мове—і гэтага даволі...

І так далей.

Усё гэта публікуецца ў газэтах. Аб гэтым усе ведаюць. Ведае польскі ўрад, польскі Сойм, польскія дэмакраты і соцыялісты. Ведаюць і... маўчаць!

Маўчаць, бо ўвесь гэны тэрор, які стасуецца да беларусаў, робіцца сьвядома і плянова. Бо ня можна-ж дапусьціць, каб кожын паліцэйскі, кожын жандар, стараста і т. п. на сваю руку зьмянялі канстытуцыю польскага гаспадарства, каб кожны школьны інспэктар сваей уладай выдаваў законы аб тым, што пабеларуску вучыць нельга, што выкладовай мовай, падобна як некалі ў царскай Расеі, павінна быць толькі мова „пануючае нацыі“.

Чаму-ж гэта так робіцца? Чаму польскія соймавыя дэпутаты, гэткія чулыя на кожнае нарушэньне ўладаю закону адносна да польскага насяленьня, моўчкі углядаюцца на грубае тапганьне ўсіх людзкіх і грамадзкіх правоў беларусаў?

Плян, у якім тэрор займае першае месца, вельмі просты. Хаця з тых зямель, якія бальшавіцкая Расея аддала Польшчы, у варшаўскі сойм паслы не дапушчаны,—яны раней ці пазьней павінны быць туды дапушчаны, беларускае насяленьне павінна атрымаць тамака свой голас. Каб-жа гэтага ня было, варшаўскія палітыкі і пастанавілі запужаць беларусаў, разьбіць усе іх арганізацыі, зьвішчыць школы, кніжкі, газэты і павысылаць або „unieszkodliwić“ па вастрогах беларускіх дзеячоў, а тады на два тыдні аб'явіць „свабоду выбараў“ і... прымусіць стэрорызаваны народ выбіраць паслоў па загаду ўлады... Бо ведаюць палякі, што калі папалуць у Сойм варшаўскі запраўдныя выбранцы народу, гатовыя крэпка пастаяць за справу беларускую, — тады з соймавае трыбуны ўвесь сьвет пачуе страшэнны акт абвіненьня польскаму гаспадарству.

Увесь сьвет пачуе аб тым, што, ня гледзячы на ўсе ўмовы з Лігай Народаў, падпісаваныя панамі Падэрэвскім і Дмовскім, у Польскай Рэчыпаспалітай цэлая нацыянальнасьць—беларусы—пазбаўлены правоў нацыянальнае меншасьці.

Пачуе, што для беларусаў польская констытуцыя ня пісана.

Пачуе, што польскі „Drang nach Osten“ пакінуў далёка за сабой нямецкіх вучыцялёў-гакатыстаў, ад якіх Польшча пабрала ўсё найгоршае,—ўсё тое, аб чым перад атрыманьнем з рук Гіндэнбурга і Людэндорфа незалежнасьці кожын польскі патрыот гаварыў з агідай і пагардай...

Польская ўлада і польскае грамадзянства лепш, чым хто, ведаюць свае грахі і баяцца, каб яны ня выйшлі на сьвет божы. Ды ўсё дарма: усё роўна, тая агіда, тыя зьдзекі над беларусамі, якія што-дня робяцца польскімі ўладамі, выбіваюцца за кітайскі мур, якім Польшча стараецца ўкрыць перад вокам цывілізаванага сьвету свае праступкі проці агульна-людзкага права, свабоды, цывілізацыі. Усё роўна, і Ліга Народаў і паадзінокія ўрады і парлямэнты вялікіх дзяржаваў даведаюцца праўду аб польскай „волі, роўнасьці і братцтве“, як нягодна насьмяялася „дэмократычная“ Польшча над усім, што найбольш сьвята для кожнага культурнага чалавека. І прыйдзе такая часіна, калі культурны сьвет пакліча на свой справядлівы, але срогі суд тых, хто, пасьля развалу „ўсерасейскае“ турмы народаў, пабудаваў польскую турму народаў...

Мы галосна і ясна кажам гэта, бо ўсе звароты беларусаў да польскае ўлады, да польскіх соймавых дэпутатаў, да начальніка польскага гаспадарства не далі ніякіх вынікаў. Нам і астаецца адна дарога: выкрываць прад усенькім сьветам гвалты і зьдзекі над нашым народам, цясьней строіць працярэбленыя рады байцоў за права беларусаў на свой быт і культуру, бараніць нашае культурна-нацыянальнае багацьце і карыстацца з кожнае магчымасьці займаць тыя пазыцыі, якія, ня гледзячы на ўвесь польскі тэрор, праўна нам прыналежаць. І мы верым у жыцьцёвую сілу нашага народу, верым, што ён і ў польскай турме народаў не загіне, як не загінуў у расейскай, і з гэтай верай у глыбіні нашае душы адказаваем польскім урадовым тэрорыстам:

— НЕ ЗАПУЖАЕЦЕ!

Ярашэўскі.

З прэсы.

У справе Віленшчыны.

Заўсёды да нас прыхільны й падаючы сваім чытачом шмат вестак аб беларускім жыцьці „Впэрэд“, львоўская украінская часопісь, ў № 56 зьмяшчае артыкул пад назваю „П. П. С. і вшэхпалякі“, гдзе разглядае віленскае пытаньне й адносіны да яго пэпэсаўцаў і эндэкаў. Перадаем яго не скарочваючы.

„Цэнт. выкан. камітэт П. П. С. выдаў 8 сакавіка 1922 г. адозву супроць палітыкі, брахні і здрады.

Брахнёй і здрадай Польшчы мае быць—паводлуг пэпэсоўскай адозвы—становішча польскіх нацыяналістычных кол, якія дамагаюцца бязумоўнай анэксіі Віленшчыны. Такое становішча вшэхпалякаў пэпэсоўская адозва называе тэрорам, злачынствам, анархіяй, разбойствам і нішчэньнем заменжнай дзяржаўнай палітыкі Польшчы, падрывам польскай дзяржаўнасьці праз бунт правіцы. Нарэшце адозва заклікае ўсіх проціў улады рэакцыі, проціў анархіі, самаволі польскіх клерыкалаў і нацыяналістаў.

Чытаючы такія пэпэсоўскія пяруновыя закіды сваім партыйным працаўнікам, мог бы хто небудзь падумаць, што П. П. С. раптам стала на грунт самавызначэньня народаў, што яна стала на абароне беларускай й літоўскай большасьці Віленшчыны, што яна для гэтага насяленьня дамагаецца народных правоў, і даць яму голас у справе праўнадзяржаўнага самавызначэньня. Але дужа мыляецца той, хто так думае. Праз усю адозву аб гэным няма ні слова. П. П. С. кідае кліч „Няхай жыве злучэньне віленскай зямлі з Польшчай“. Толькі П. П. С. хоча зрабіць гэта так, каб адначасна з тым не стварыць новага часовага стану, каб ня было новых камісій Лігі Народаў і нотаў Антанты.

Адным словам, П. П. С. хоча учыць вшэхпалякаў, як трэба найлепей анэксываць чужыя землі й пры тым скары-

Даводзім да ведама сяброў Саюзу Работнікаў Хлебаробаў, што з прычыны арыштаў часьці прэзыдыума, часова спыненая дзейнасьць Саюза ізноў наладжана.

Канцэлярыя Саюзу перанесена на вуліцу Жэлігоўскага № 4.

Прэзыдыум.

тацъ насяленьне анэксыяваных земляў як міжнародны чыннік.

Ды вшэхпалякі ня вельмі бяруць да сэрца сабе пэпэсоўскія парады („тромтадрацыі"), бо яны ёсьць лепшыя майстры ад пэпэсоўцаў".

Не даваць сялянам зямлі!

Уладар маёнтку Дарашковічы, Мікалаеўскай гміны, Дзісьненскага павету, Адрыян Капылоў захацеў беззваротна перадаць у поўную ўласнасьць сялянам вёсак Бярозава і Фролава сваю зямлю—усяго каля 710 дзесяцін.

Пры гэтым гр. Капылоў паставіў такія варункі: 1) каб участкі былі ня меней, як па 15 дзесяцін.—і затым падзеляны былі на жэраб'ю паміж гаспадарамі ў вечнае валаданьне, 2) каб падораныя прынялі на сябе выплату іпатэчных даўгоў у суме ста дзесяцёх тысячаў рублёў і 3) каб яны-ж заплацілі ўсе пошліны і іншыя расходы па апэрацыі перадачы зямлі.

Аднaчасна гр. Капылоў заявіў, што фольварак яго Грэціна, 80 дзесяцін лепшай у ваколіцы пахаты, ён хацеў-бы афяраваць гаспадарству з тым, каб на ёй з будучага году было прыступлена да заклад зін ніжэйшай агранамічнай школы і паказальнай гаспадаркі.

Заява гэтая была напісана гр. Капыловым і пададзена п. зямельнаму камісару Дзісьненскага павету і п. Дзісьненскаму старасьце. Гр. Капылоў пакідаў за сабой 212 дзесяцін зямлі і 400 дз. лесу, які павінен перайсьці ў казну.

Маёнтак Дарашковічы быў куплены гр. Капыловым без якіх небудзь льгот з боку Расейскага ўраду ў 1909 г. ад сям'і Рыхтэр, якая так сама купіла Дарашковічы ў 1880 г. ад п. п. Карпава і Кастравіцкага. Дзеля сьцьвярджаньня ўсяго сказанага гр. Капылоў мае дакумэнты.

Пасьля першай сваёй заявы, пададзенай 17 кастрычніка 1921 г., гр. Капылоў падаў 17 сьнежня зямельнаму камісару новую заяву, ў якой пісаў, што за недахватам зямлі ён змушан „нормай для надзелу сям'і з адным дарослым мужчынай прыняць участак у 10 дзесяцін, з дапаўніцельнымі прырэзкамі на многасямейных."

Такім чынам мы бачым, што гр. Капылоў хацеў зрабіць вельмі добрае дзела—аддаць аграмадны абшар сваей зямлі сялянам суседніх вёсак за пусьцяковы выкуп *)

Аднак, аказалася, што аддаць амаль ні дарма сялянам зямлю ў Польскай дзяржаве ня можна, бо паном польскім, відаць гэта не падабаецца.

І вось, доўга чакае гр. Капылоў адказу на сваю заяву і не дачакацца. Тады ён едзе ў м. Глыбокае (17 лютага 1922 г) і даведаваецца ў п. зямельнага камісара, што „Kolegium Delegatury Okręgowej Głównego Urzędu Ziemskiego w Grodnie" адмовіло гр. Капылову ў яго просьбе.

Ня можа быць!—скажаце Вы, каб можна было так аднесьціся да заявы гр. Капылова, каб гэта рабілася ў „дэмакратычнай" польскай рэспубліцэ! Аказваецца, што вельмі і вельмі можна; мала таго—ня то што можна, а навет трэба. Як можна дапусьціць, каб сяляне атрымалі зямлю дарма. Тады і ў іншых мясцовасьцях захочуць таго ж.

Далей,—як можна дапусьціць, каб зямлю атрымалі тутэйшыя сяляне-беларусы, а не вайсковыя калёністы з Кракова, або Пазнані.?

У рэшце — як можна, каб добры прыклад выходзіў ад чалавека не паляка.

Справу затармазілі і толькі праз чатыры месяцы пасьля першай заявы гр. Капылова паведамілі п. Дзісьненскага Зямельнага Камісара (а не самага Капылова), што ў просьбе гр. Капылова адмоўлена, бо ня былі прадстаўлены дакумэнты, якія ўстанаўляюць яго права на валаданьне Дарашковічамі і што маёнтак гэты ня быў у свой час сканфіскованы, а так сама не прадстаўлены тэхнічны праект парцэляцыі.

Ну і мудрасьць горшая за глупату! Калі патрэбны былі дакумэнты то трэба было-б папрасіць аб гэтым у гр. Капылова і ён бы прадставіў іх. Што-ж датычыць другога трэбаваньня—прадставіць праэкты парцэляцый дык ня можна трэбаваць іх, ня вырашыўшы справы прынцыпова, ці будзе дазволена перадача зямлі. За такі праэкт парцэляцыі запрасілі ў сялян паўтара мільёны марак. Ці-ж могуць бедныя сяляне пайсьці на вялізарную матэрыяльную рызыку, ня ведаючы, якая з гэтага будзе карысьць.

Так, так, паночкі і паны з Ужэнду ў Горадні! Відаць, што вам ня ходзіць аб тым, каб палепшыць долю сялянскую рэдкаю ахвярнасьцю гр. Капылова. Вам не падабаецца такая ахвярнасьць. І вы пачынаеце палітыкаваць на сьвятой і чыстай справе, якую вы хочаце загубіць канцэлярщчынай і валакітай.

Вы думаеце, што ў барацьбе з гр. Капыловым і сялянствам вы выйдзеце перамоэжцамі, тым балей, што за Вамі ўся сіла, а за праціўнай старaной—бязсільле і апрача газэт няма дзе бараніць сваю справу.

Трудна спадзявацца, каб знайшліся энэргічныя абаронцы гэтай справы сярод польскіх урадовых і навет грамадзянскіх колаў, бо ўся зямельная справа ў Польшчы завязла недзе і забылася—мусіць надоўга.

Селянін.

*) Па казеннаму польскаму курсу за сто рублеў плаціцца 216 п. марак. Значыцца за 110,000 рублеў трэба было-б заплаціць цяпер 62,000 п. м. — усяго тады як 710 дзес. зямлі, якую гр. Капылоў аддае сялянам трэба было заплаціць ня менш, як мільёнаў дваццаць польскіх марак.

Што чуваць у сьвеце?

Савецкая нота Балтыцкім дзяржавам.

З прычыны канфэрэнцыі Балтыцкіх дзяржаў у Варшаве, Савецкая ўлада паслала аднаковыя ноты Фінляндзіі, Эстоніі і Латвіі, у якой перасьцерагае іх ад ваенных конвэнцыі з Польшчай.

Міністэрскі крызыс у Польшчы.

Міністэрскі крызыс у Польшчы прашоў. Большасьць міністраў з апошняга кабінэту на чале з Панікоўскім асталіся на сваіх становішчах.

Харвацыя дамагаецца незалежнасьці.

Харвацкі блок дамагаецца, каб на міжнароднай гаспадарчай канфэрэнцыі, былі разгледжаны справы Харвацыі і прызнана незалежнасьць.

Унутраны доўг Польшчы.

Унутраны доўг Польшчы да 31 сьнежня 1921 г.—250 мільярдаў 305 мільёнаў марок.

Змаганьне з мілітарызмам.

Другое паседжаньне Лігі Народаў даручыло асабліваму Камітэту выпрацаваць плян зьмяншэньня войск ува усіх дзяржавах Эўропы.

Гэнуэская канфэрэнцыя.

— Кэмаль-Паша аб'явіў, што Турцыя, як не запрошаная на канфэрэнцыю ня будзе магчы прызнаць яе пастаноў.

— Чэскі урад атрымаў заручэньні, што Грэцыя будзе выступаць на канфэрэнцыі солідарна з Малай Антантай.

— З прычыны адказу Злучаных Штатаў, Гэнуэская канфэрэнцыя ня зможа выканаць усіх заданьняў і дзеля таго адкладаецца на невядомы час.

Рэвалюцыйны рух у Індыі.

Англійская улада ў Калькуце адкрыла аграмадную вайскова-рэвалюцыйную арганізацыю ў Індыі. Уся Індыя была падзелена на акругі, у якіх працавалі групы, злучаныя у аддзелы. Аддзелы гэтыя маюць вялікі лік захаванага аружжа, якое яшчэ ня выкрыта. Агульнае пляновае выступленьне мелася быць у канцы мая.

Заняцьце Бухары.

Энвэр-Паша на чале чырвонай арміі заняў Бухару і стварыўшы савецкую уладу увайшоў у кантакт з Расеяй.

Хто запрошаны ў Гэную.

На Гэнуэскую канфэрэнцыю запрошаны: Англія, Расея, Францыя, Італія, Злучаныя Штаты, Бэльгія, Японія, Гішпанія, Партугалія, Нарвэгія, Швэцыя, Данія, Чэхословакія, Швайцарыя, Нямеччына, Югаславія, Баўгарыя, Грэцыя, Нідарлянды, Люксэмбург, Фінляндыя, Аўстрыя, Вэнгрыя, Румынія, Польшча, Албанія, Эстонія і Літва.

Агітацыя бальшавікоў супроць Польшчы.

Бальшавікі вядуць шалёную агітацыю супроць палякоў, накіроўваючы на іх гнеў масаў. Па вуліцах расклеены плакаты з карыкатурамі на палякоў, а ў газэтах пішуць, што палякі вымагаюць ад саветаў замнога золата, каб зруйнаваць бедную рабоч. люднасьць. Заклікаюць палякоў, каб не вярталіся на бацькаўшчыну, дзе правіць польскі бізун, а жыўнасьць ёсьць толькі для багатых, а не для бедных. (РідинйКрай.)

Сьнег.

Гляджу праз вакно з густой кратай—
Там сьнегу багата, багата;
Там шэрае неба застыла
І сьнег мяце, сыпець, віхруе...
Як сэрца за шчасьцем сумуе!
Як воля мне дорага, міла!
Хоць там за вакном з густой кратай
Так сьнегу багата, багата.,.

Астрог 1922 г. Л. Р.

Пасьвячаецца Н. А.

...Я кінула-б жыцьце: абрыдла мне яно
Памерці-бы, пайсьці...
Н. Арсеньнева.

Не, ня кідай ты жыцьця маладога!
З зорак, так сама, прыклад не бяры,
Што, як пакорныя служкі у Бога,
Вечна аднолькава сьвецяць з гары.
Што гэных зор няжывое зіяньне,
Хоць бы сярод самых цёмных начэй?
Што супраць сьветлыя думкі буяньня,
Думкі, што сьвецяць з вачэй?
Супраць гарачасьці сэрца жывога
Што таго сонца агні?
Што шырыня таго неба сівога
Проці душы шырыні?
Што таго ветра размашныя веі
Проці размахаў людзкога вума?
— Проць сілы духа і сілы ідэі
Большае сілы, павер жа, няма.
Усё прападзе, увесь сьвет безпаўротна,
Бы ня было яго, шчэзьне, як дым.
Толькі ж адно будзе жыць несьмяротна
—Нешта, што сілай мы духа стварым.
Нашых ідэяў, што сьвецяць для нас, —
Толькі у гэтым прызыў чалавечы,
Толькі у гэтым адказ.

Н. Г.

Эліза Ажэшкава.

Люблю Цябе!...

Люблю Цябе ў паху сьвежа ўзаранае зямліцы, ў шолаху каласкоў, ў шуме лясоў, ў туманох над пожнямі, ў сьпеве жалейкі пастуховае над узьбярэжжам сенажацяў.

Люблю Цябе ў камянёх ды крыжох прыдарожных, ў адзінокіх палявых ігрушах, у дзікіх зёлках, у белых сьнягох, у дыямэнтах шэрані, ў рубінах заходу, ў сініх сьвітаньнях і зорных ночках.

Люблю Цябе ў хмарных скляпеньнях, што панураю страхою высяцца над гарачаю бронзаю Тваіх восеняў, у зорках і рачных хвалях, у аблоках і рэхах, у тых патаемных зморшчынках, якімі вятры пакрываюць прасторы Тваіх пяскоў, у нязьлічоных баразнах, што павырэзвалі лемяхі аратых на Тваім улоньні.

Люблю Цябе ў Тваіх лятуценьнях, цярпеньнях, уздыханьнях, залатых снох і каменных' долах, у зіхаценьні і патуханьні Твае славы, у вялікіх духах Тваіх рыцараў і песьняроў.

Але найбольш, найгарачэй, найвярней, поўная гордасьці люблю Цябе у Тваім няшчасьці.

Калі-б Ты была апранутая ў пурпур, прыхарошаная каронаю, асьветленая зіхаценьнем сусьветнае славы,

Калі б на возе, спавітым вясёлкаю, ды запрэжаным залацістымі коньмі сьвяткавала Ты пад аблокамі дзень свайго трыумфу, змушаючы схіліцца перад сабою ўсё, што жыве.

Калі-б з рук Тваіх сыпаліся пэрлы і рожы, а над галавою віліся арлы перамогі.

Дык можа быць, што грудзі мае засьмяглі-б ад жальбы, што я, дзіцё Твае, ня ведаю, што гэта ёсьць-шчасьце.

Магчыма, што пайшла-б я у далёкія сьветы шукаць кветак цудоўных і духаў-анёлаў.

Але твар Твой пацямнеўшы ад нязьведанага жалю, шаты жалобныя разьвеяліся на сухія вятры, карона разьбітая, ногі скутыя ланцугамі, а трыумф у бяздонных далях будучыны.

Дык жа-ж да Тыайго зраненага ўлоньня, о зьняважаная, здраджаная, растаптаная, жаласная, я прыхінаю душу сваю, да Тваіх скутах ног, схіляю чало сваё, а Твае неба пахмурнае для мяне лепшае ад сонцаў, што ў вагністых водблесках прабягаюць зорныя прасторы.

І хочу сабраць я ўсе сілы, увесь бліск, увесь голас, каб праз жаўранчыка звіненьне, салаўінае пяяньне, шамраньне крыніцаў, шум лясоў, пурпур рожаў, золата каласоў, пах руні, песьню хваляў і біцьцё сэрца—крыкнуць: Люблю Цябе!

Флёрыянаў 1908, жнівень.

Пер. А. С.

НЕЗАДАЧА.

(Б ы л ь.)

Часовы камісар N-скай франтовай надзвычайнай камісіі па змаганьню з контр-рэвалюцыяй, сьпякуляцыяй і дзезерцірствам таварыш Батрачонкаў ехаў на аўтамабілі ў сваёй матроскай куртцы дамоў к Ільлі на сьвята.

Ільлю сьвяткуюць, як ведама, 20-га ліпня пастараму стылю, калі пачынаецца жніво. У гэты дзень у Залужанскай парахвіі, з якой родам Батрачонкаў, пасьля адправы ў царкве пачынаецца за пьвінтарам на аселіцы кірмаш і кірмашовая гульня. Сходзіцца сюды ня толькі ўся свая парахвія, але бываюць хлопцы і дзеўкі з усіх вакалічных парахвій, а заядлыя гульцы прыходзяць і з дужа далёкага боку.

Да залужанскае царквы нямаш, бадай, і дзьвёх вёрст ад Батрацкіх Дворкоў, дзе жывуць Батрачонкавы. І камісар скрозь увесь час, выехаўшы з места і аж да гэтай старасельскай грэблі, спамінаў на сваё далёкае маленства і на кірмашы ў Залужжы і меркаваў, як зручней: ці пайці заўтра ў царкву пехатою, з усімі дваркоўскімі хлапцамі й дзяўчатамі разам, ці задзержаць аўтамабіль на адзін дзень і паехаць на кірмаш на ім? Паехаць пазьней, проста на самую гульню, пасьля адправы?

Ен мімаволі пасьміхнуўся ў канцы сваіх разваг, стварыўшы сабе ў галаве захопліваючы абраз, як аўтамабіль з ім камісарам, і з грудам дваркоўскіх дзевак пракоціцца сярод самага кірмашовага збою... Усе людзі глядзяць і пытаюцца; што за дзіва, хто там такі?

— Хай жыве рэвалюцыя! —голасна крыкнуў Батрачонкаў, шум машыны і сьвісг ветра схапілі яго словы.

— Што вы, таварыш? — пачуў, аднак, шафёр і аглянуўся.

— Нічога, нічога... — сканфузіўся матрос.

Ля самых Дворкаў на шляху таксама ёсьць грэбля, і Батрачонкаў спомніў на земскага начальніка Шальновіча, як ён заўсёды з сваім аўтамабілем тапіўся там.

— Падумаць: быўшы падпасак Арцёмка Батрачонак —другі чалавек, што едзець па гэтым шляху на аўтамабілі; першы быў Шальновіч, другі — ён, вось цяпер,"—падумаў аб сабе самім матрос.

Гадоў дзесятак ці болей мінулася з тае пары, як Шальновіч першы раз у

Зьезд трох інтэрнацыяналаў.

Бюро III Інтэрнацыяналу дастала ад зьезду соцыялістаў у Франкфурце дэпешу аб устанаўленьні праграмы кангрэсу ўсіх трох інтэрнацыяналаў. Праграма прадбачыць утварэньне агульнага соцыялістычнага фронту. (Впэрэд).

Кабінэтны крызыс ў Англіі.

Кабінэтны крызыс ў Англіі трэба лічыць скончаным. Л.-Джордж па просьбе сваіх прыхільнікаў згадзіўся застацца на сваёй пасадзе.

Міжнародная санітарная канфэрэнцыя.

20 сакавіка адбудзецца ў Варшаве з ініцыятывы Лігі Народаў міжнародная санітарная канфэрэнцыя. На канфэрэнцыю запрошаны прадстаўнікі бадай усіх дзяржаваў сьвету. Мэтай нарадаў будзе змаганьне з эпідэміямі й эпідэмічны стан Эўропы. (Впэрэд).

Канфэрэнцыі савецкіх рэспублік.

У старшыні ВЦІК 22 лютага адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў савецкіх рэспублік—Беларусі, Украіны, Азэрбэйджану, Арменіі, Грузіі, Бухары й рэс. Дал. Усходу, на якой падпісан дагавор, на моцы якога даручана абарона інтарэсаў гэтых рэспублік на канфэрэнцыі ў Гэнуі прадстаўніцтву РСФСР. Канфэрэнцыя упаўнаважыла расейскую рэспубліку ад імя усіх падпісаць акты, што будуць зроблены на гэтай канфэрэнцыі.

Судовы працэс у Львове.

8 сакавіка ў Львове закончыўся вялікі судовы працэс за дзяржаўную здраду рабочых па мэталу. Працэс адбыўся пры закрытых дзьвярох у працягу пяці дзён. Абвінавачвалі як агітатараў чужых дзяржаў.

Засуджаны Радзеня за злачынства з § 58 б) ц) к. к. на 4 года цяжкага астрогу й Мінцер за злачынства з § 65 к. к. на 11 месяцаў астрогу з пастом што месяца.

Праваслаўная царква.

У „Рідным Краі“ № 50 зьмешчана пісьмо да рэдакцыі ўладыкі Панцелеймона б. япіскапа Навагрудзкага і Пінскага. Уладыка маладыя годы правеў у Вільні, дзе пахаваны і яго бацькі, пасьля звальненьня ад кіраваньня эпархіяй прасіў дазволіць яму пасяліцца у роднай Вільні, але прымусова з агентам быў адпраўлен у Мілеўскі манастыр, дзе адбывае пакуту засуджанае духавенства.

Чуткі пра палітычныя матывы адказу падпісаць конкордат не праўдзівыя. З маладых гадоў Уладыка ніколі не займаўся палітыкай, а ў апошнім выпадку меў на ўвазе толькі правілы Хрыстовай Царквы.

Голад у Расеі.

Жудасныя весткі прыходзяць з цэнтральных губэрняў Савецкай Расеі. Сяляне ўжо даўно паелі сваю апошнюю жывёлу. Людаедцтва пашыраецца. У вёсцы Навакраюшкіно (Саратаўска губ.) селянін зарэзаў і з'еў сваю ўласную жонку. Пры вобыску знайшлі ў яго яшчэ застаўшыяся 8 фунт. чалавечага мяса. У вёсцы Вусьцінаўцы сялянка зарэзала і з'ела сваю дачку. Цэлыя сямейства ядуць трупы, украдзеныя з магільнікаў. У Таўстоўскай воласьці шмат трупаедаў. Па валасьцёх прымаюцца меры барацьбы з гэтым Пастаноўлена трупаедаў і людаедаў ізоліроваць, а іхніх дзяцей забіраць у „дзіцячыя хаты“.

У з'вязку з пашырэньнем голаду павялічваецца лік уцекачоў з галодных мясцоў. Гэтыя галодныя масы пруцца галоўным чынам на Беларусь. Жыхары прадаюць за бязцэнак сваю маёмасьць і без усялякага пляну ідуць і едуць, з'біраюцца тысячамі на станцыях, галадаюць, гінуць ад холаду, голаду і тыфусу. Савецкая ўлада бязьсільна, каб спыніць гэтае масавае перасяленьне народу.

У Орску (Аранбур. г.) з 18000 галадаючых памёрла ў працягу пары тыдняў больш за 3 тысячы. Сьмяротнасьць сярод дзяцей даходзе да 95 процэнтаў.

Усерас. Цэнтр. Вык. Кам. у дадатак да дэкрэту аб із'яцьці музэйнай маёмасьці загадаў мясцовым саветам, каб яны ў месячны тэрмін з дня апублікаваньня пастановы забралі з царкоўнай маёмасьці перададзенай дзеля карыстаньня групам веруючых усіх рэлігіяў, усе дарагія рэчы, —золата, срэбра, каменьні, і перадалі органам Нар. Кам. Грош. спраў дзеля Цэн. Кам дапамогі галадуючым.

Губэрскі з'езд саветаў пастанавіў скарыстаць багацьце быўшага Салавецкага манастыра дзеля галадуючых.

Літоускія справы.

— Урад прыступіў да апрацоўкі праекта канстытуцыі.

— Перадвыбарная агітацыя ў Літоўскі Сойм ужо пачалася.

— Ковенская газэта „Эхо“ паведамляе, што вынікі неудачных выступленьні Віленскага Сойму ў Варшаве змушаюць Польшчу прызнаць Літву „de jure“

З культурнае нівы.

Беларуская культурная праца мае перад сабой, паміж іншым, вялікую задачу: прысвоіць беларускай літэратуры вялікія творы мысьлі другіх народаў, здабыўшыя ўжо даўно сусьветнае значэньне.

Задача гэта з кожным годам становіцца ўсё больш і больш пільнай, асабліва ў сувязі з істнаваньнем беларускіх сярэдніх школ, якія імкнуцца да таго, каб нашу моладзь навучаць і разьвіваць, карыстаючыся роднай мовай. Ведама, што нішто так не разьвівае маладыя душы, як знаёмства з гісторыяй і літэратурай ня толькі сваей, але і сусьветнай. Слабое веданьне чужых моваў не дае магчымасьці нашай моладзі (і наагуль інтэлігенцыі) знаёміцца з творамі чужых літэратур у арыгіналах. Патрэбны пераклады. А як іх у беларускай мове нямашака, дык хоч-ня-хоч прыходзіцца карыстацца перакладамі на больш блізкія славянскія мовы, як прыкладам польская, расейская і др.

Апошняе прымушае нашу моладзь больш чытаць у чужых мовах, чым у роднай. Вось-жа, каб памагчы гэтай бядзе, беларускія культурныя працаўнікі, згуртаваныя ў Беларускім Навуковым Таварыстве ў Вільні, ўзяліся за вялікую і цяжкую працу—дзеля прысваеньня беларусам лепшых твораў сусьветнае літэратуры.

На засяданьні ўраду Бел. Навук. Т-ва 14 сакавіка была намечана праграма перакладаў, якая ўжо часьцю і выпаўняецца. Праграма абнімае творы грэцкае і лацінскае літэратуры: Гомэра („Іліяда“ і „Одиссэя“, якія тлумачацца), Софокла („Антыгона“), Плютарха, Овідыя, Цэзара і др., абыймае творы заходня-эўрапэйскіх літэратур: Данта, Шэкспіра. Гетэ, Мопасана, Вэрлена (пераклады зроблены Максімам Багдановічам), урэшце творы польскіх і расейскіх аўтараў (перакладзены з расейскае мовы: „Рэвізор“, „Тарас Бульба“—Гоголя, Караленкі „Лес шуміць“, Купрына „Алеся“, Лермонтава „Дэмон“).

Мы тут даём толькі галоўныя рысы праграмы, якая йшчэ мае быць распрацавана дэтальна, і тады падамо яе да агульнага ведама. каб магчыма шырэйшы круг людзей мог прыняць учасьце ў гэтай працы. Ведама, праца гэта павінна быць раскладзена на годы, бо яе скора ня зробіш. Дый, апрача самога перакладу, патрэбны значныя грошы, каб усё гэта надрукаваць. І затым-то беларускаму грамадзянству прыдзецца вельмі напружыць свае матэрыяльныя сілы, каб плян Бел. Навук. Т-ва мог быць чым—хутчэй праведзены ў жыцьцё.

Але пастаўленая задача лішне важная, каб не знайшлося на выпаўненьне яе капіталаў, для якіх друк такой сыстэматычнай бібліотэкі будзе вельмі выгодным памяшчэньнем: збыт гэткіх кніжак бязумоўна абясьпечаны ў вялікіх разьмерах. І мы можам толькі пажадаць ініцыятарам гэтае справы сіл і энэргіі, каб давясьці яе да канца.

А. Н.

Падарунак гр. А. Капылова.

Адначасна з тым, як гр. А. Капылоў зрабіў польскім уладам заяву аб аддачы ім сялянам бліжэйшых да Дарашковіч вёсак 710 дзесяцін добрай зямлі, ім жа выказана было пажаданьне ахвяраваць польскаму гаспадарству фальварак Грэпіна, каб там была адчынена ніжэйшая агранамічная школа і паказальная гаспадарка.

Дзеля таго, што польская ўлада не дала па гэтаму пытаньню а ніякага адказу, гр. Капылоў у размове з адным з прадстаўніком Беларускай Школьнай Рады выказаў згоду на перадачу фальварка Грэпіна пад агранамічную беларускую школу, аб чым прасіў афіцыяльна да яго зьвярнуцца. Маем надзею, што беларусы зробяць належныя крокі і астануцца больш уздзячнымі гр. Капылову чым тыя, да каго ён зьвяртаўся раней.

Маленькі фэльетон.

Пісьмо ў рэдакцыю.

ПАВАЖАНАЯ РЭДАКЦЫЯ!

Далучаючы пры гэтым карэспандэнцыю, прашу не адмовіць надрукаваць яе. Хай сьвет дазнаецца, што не так ужо наша вёска забытая Богам і людзьмі, як гэта некаторым здаецца.

У маей роднай вёсцы Ахратуй, што належыць да сучаснай Польшчы, а перш да „Srodkowej Litwy“, а яшчэ перш да „Сѣверо-Западнаго края“ а каліcь, у лепшыя часы да Беларуска-Літоўскага княжства, жыў сабе Гаротны чалавек па найменьню Беларус, а папольску бальшавік, а пабальшавіцку конт-рэвалюцыянер.

І больш ён быў Гаротнік, як Беларус, бо беларускіх газэт не атрымліваў (іх палілі на пошце), ня біўся калі прыблуды якіясь абдзёрлі яго, як ліпку, сярод белага дня на шырокім шляху, калі дзялілі яго Бацькаўшчыну, калі прадавалі гэтым глухім куце паказаў людцам новае дзіва тэхнікі, машыну-самакат.

Было якраз у восені, калі сяляне капалі бульбу і дабіралі канапелькі. Надвор'е стаяла сухое й пагодлівае, толькі ранейшыя дажджы папалівалі лужын, дзе нізкая дарога, і зусім раставесілі грэблю. Зашумела нешта нязвычайнае з-пад лесу і раптам закурылася ца шляху за дваркоўскімі за гумнамі. Шпаркашпарка, на ўсю сілу коціцца панская карэта... бяз коні! Усе пакінулі й бульбу й канаплі,—паляцелі, як жывы, глядзець. Бабы ад страху ледзьве не памлелі, гэтак напужаліся, а таксама і старэйшыя мужчыны мелі пудv. Толькі нехта з маладых, „сьвецкіх“, гукнўў вясёла й дужа каб усе-чыста чулі: „А во-о!.. ту-ма-біля!“ — і ўзьлез на леску, каб даўжэй глядзець і відзець аж за курганком.. Петракоў сабака сядзеў ды як вяхнець! і куляю закапыціў наўздагон машыне. Хлопчыкі — за ім. Не пасьпелі яны заскачыць за гумны, як схавалася машына за гару, нырнула там да грэблі. Але і села.

Батрачонак вёз тады з гаспадаром карчы і суччя з ляда. Гаспадар застаўся насьцілаць перад машынаю гальлё, а хлопчыка земскі пагнаў у Дваркі па мужыкоў, каб ішлі выцягіваць з балота самакат.

Камісар страхануў з сябе тыя ўспамінкі: што было, тое было. Хто-б мог спадзявацца, што яно так шыбка і раптоўна зваліцца далоў?

Мінулося, і цяпер на самакаце, як некалі земскі, едзець ён, камісар паўстаўшага пралетарыяту. Яго машына шчасна пераехала гразкае старасельскае поле,— каб гэтак сама пераехаць і сваю грэблю; было-б дужа прыкра і сорамна, каб і яго, як таго пана, ратавалі мужыкі з балота.

Аўтамабіль радасна імчыцца падгару і вось за рэчкаю пачынаецца быўшая панская зямля — вялікіх паноў Шамёт-Галавінскіх. Шырока й далёка разлягла-ся... За тым вун гайком раней, як хадзіў ён усімі разам у намастыр на Малую Прачыстую маліцца богу, відаць былі белыя, быццам з крэйды, сьцены панскіх будынкаў. Цяпер іх няма, — бязуважна паглядзеў камісар у той бок,—няма, мужыкі спалілі... Тырчаць толькі два нейкіх стаўбы, як сажа, чорныя, мабыць, абгарэлыя. Цяпер няма тых белых будынкаў, і што гэта, што аж поле, засеянае ня ўсьцяж, а толькі лапікамі зялёнай ярыні, што аж яно быццам памізарнела?

Нічога...

Нічога, бо ад гэтага мала зьмяншаецца вялікае задаваленьне, што яно, поле—ужо агульная народная маемасьць і будзець некалі яшчэ лепей выглядаць, чым выглядала за панамі.

Адзаду засталася вілаватая рэчка, з кустамі па берагох і бліскучая на сонцы там, дзе бераг бяз кустоў. Азначаная альшэўнікам вілася яна вузкаю стужкаю пасярод шырокага паса зялёнага логу, сёлета яшчэ няскошанага, хаця заўтра Ільля.

Ад логу пачынаўся адхоны пакат, засеяны лёнам. Адсунулася рэчка, адбегся і той лён, вось мінаецца бульбоўнік. З высокага пункту відаць далёка-далёка ўвесь прастор наўкол: жоўтае жыта, сівыя хаты з зялёнымі канаплянькікамі, маркотны могільнік збоку і сіняя каёмка лесу з усіх бакоў.

Ціхім сумам гарнула з таго прастору на камісэраву душу, дарма што намагаўся ён радавацца, што паноў няма і ўсё зрабілася агульнай народнай маемасьцю.

Ціхім сумам гарнула на яго з гэтае пустыні, калі поміма яго волі зьяўлялася параўнаваньне з клумным гоманам і неспакоем жыцьця ў N-ску, асабліва цяперашняга, як прысунуўся фронт і прыехала «чразвычайка» на чале з ім, Батрачонкавым.

Што маець супольнага з яго роднай пустыняй ўся тая куламеса людзей, сярод якой цяпер ён, дзіця палёў і лясоў, дзівам замяшаўся?

І сярод той шумнай абстаноўкі ён у тайнасьці свае душы быў дужа самотны.

Стараўся быць сумленным камуністам, і дзеля таго так войстра адчуваў сваю самоту сярод сваіх таварышоў па рабоце. Іх—цэлая туча, розных сяброў калегіі, агентаў, падагентаў, служачых. Усе яны—партыйныя ці спачуваючыя, што быццам напісана ў кожнага на лобе, па грубаватай сьмеласьці можна пазнаць. Але ніводнага добрага чалавека ня чула камісарава сэрца і ніводнага запраўднага камуніста не знаходзіў ён.

Прыязнасьць меў там толькі да ахраны, да салдатаў, бо яны былі дзеці адчэй з ім пустыні, сяляне, апранутыя пасалдацку, а ў тайнасьцях сваіх мужыцкіх душаў ня любіўшыя тое самае, што ня любіў і ён. Гэтая рэч адчувалася ім, а таксама імі—падсьвядома і давала яму, здальнейшаму сярод іх, папулярнасьць і галасы пры выбарах.

Змалку дзён ня любіў ня толькі паноў, але ўсіх, апранутых „папанску“, значыцца ў гарадзкую вопратку, усіх „у чорным“.

І толькі тое, што пераняўся ідэямі камунізму і сам апрануўся ў матроскую куртку, толькі тое не давала ходу яго зьнялюбеласьці да „чорнай“ куламесы, сярод якой праз вайну і рэвалюцыю дзівам замяшаўся і працаваў.

Толькі-ж чаго шукаў цяпер у жыхароў пустыні, — не знайшоў...

Праўда, грэблю праехаў добра, не ўтапіўся, і ў лазьню пасьпеў памыцца перад сьвятам, але ў лазьні з ім усе, пачаўшы ад шафёра, абыходзіліся як-бы з панам: стараліся падаць вады, венік, прасілі дазволу папарыць яму сьпіну і рабілі сотню іншых дробных, але забойчых яго ідэйнасьці ўчынкаў. Старыя дзяды, як змовіліся казалі яму: „вы, Арцёмка“, або „вы, Халімонавіч“, што страшэнна падабалася яго бацьку, ды на сьмерць атручала камісара. Ніхто ў яго нічога ня спытаўся, хаця-ж спрадвеку тут вялося, што ўсякага новага чалавека, салдата, „сьвецкага“, нейкі час проста мучылі дапытамі аб навінах. Што болей за таго: ніхто ня прыйшоў да іх на двор, дзе пад павецьцю стаяла нязвычайнае для ўсіх дваркоўцаў дзіва-самакат. Баяліся ці не хацелі?

Пакуль у Халімонавых, прыйшоўшы з лазьні, расьпівалі прывезеную Арцёмкам бутэльку самагонкі і заядалі сырым салам, купленым за тры зялёнае „кярэнкі“ ў суседа—„кулака“ (як абазваў яго ня к толку тут, сярод сваіх, шафёр), па ўсіх дваркоўскіх хатах, а цераз краўца з Залужжа і ў залужанскіх на ўсі лады званілі, што Батрачонак-камісар прыехаў на машыне рабіць заўтра рэвізію ў Залужжы у папа і прывёз з сабою бачонак самагонкі і аж... пятнаццаць хунтаў „кярэнскіх“ грошы. — „А можа ёсьць і царскія, хто яго ведэе“ — дагадываліcь бабы.

Царкоўны стараста пабег к папу і перастрашыў матушку, што аж самлела. Бацюшка скрозь ноч паехаў у мясьпечка да свайго прыяцеля-аптэкара, у якога пляменьнік быў таксама ў нейкіх камісарах. Аптэкар напісаў к пляменьніку пісьма, а бацюшку схаваў ў аптэчным у падвале.

Начою пашоў дождж. Раніцаю, дачуўшыся, што залужанскі фэст чамусь растроіўся, камісар страшэнна пакусаны за ноч блыхамі, хмуры, засмучоны ехаў назад у N і перагнаў на старасельскай грэблі папоўскую хурманку.

Цераз дзень ён быў арыштаваны, і адданы пад суд за сьпекуляцыю, п'янства і шкодную для службы адлучку для асабістых патрэб на казённым самакаце.

Максім Гарэцкі.

Белавескую пушчу, калі закрывалі школы, кааператывы, калі надзялялі ўланаў яго зямелькай, калі без яго склікалі розныя канфэрэнцыі і шм. што інш. Здаецца ў такога чалавека і ворага не павінна быць. А тым часам ёсьць— у асобе паліцыянта, які жывець у суседнім мястэчку Страхадчына. Прышоўшы да Гаротніка паліцыянт, кажа: „ты выглядаеш на чалавека, які надумаў выпісаць беларускую газэту“. І давай яго кумячыць чым папала, прыгаварываючы. „Ты, кажа, бальшавік, паўстанец; ў цябе пад ногцямі чорна—ты закапываеш у зямлю аружжа і літэратуру, ў цябе вочы сінія, бо ты небу на мяне жалішся. Ты ў рай Леніна залізаўся Адамам—вось мы цябе туды і атправім“. Але ня было ўжо каго адпраўляць, бо душа Гаротніка паляцела ў нябесны рай і сказала там Богу:—Божа, падлі газы ў сваю лямпу, бо там надта сьцюдзена і цёмна.

P. S. Ня выводжу маралі, бо карэспандэнцыя і без таго ўжо падобна на байку, а пры тым лягчэй ваўка пераканаць у вялікім назначэньні вегэтэр'янства, як.,. і так далей.

З пашанай Сучасны.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Вёска Сёгда, Райчанскай гм., Навагрaдскага павету.

У нашай вёсцы стаіць кулямётная каманда N-га уланскага полку. 3-га студня г. г. здарылася здохнуць ў камандзе каню. Садраць скуру з каня капрал Вяленіч, разам з некаторымі іншымі жаўнерамі-каталікамі, загадвае выняткова праваслаўным беларусам, маладым жаўнерам-навабранцам, незадоўга перад тым набраным ў Горадзеншчыне і прысланым ў полк. Калі скура з коня была здзёрта, пан Вяленіч прымушвае тых жа самых праваслаўных беларусоў уцягнуць абадранага каня ў хлеў, тамака падняць і паставіць каня на ногі, адпаведным чынам яго прывязаўшы і падпёршы. Маладыя жаўнеры спрэчаюцца і адмаўляюцца рабіць загадваемае, але пан Вяленіч і кампанія пагражаюць бізунамі. Урэшці, калі і гэта хочучы-няхочучы было зроблена, пан Вяленіч загадвае ўсім праваслаўным беларусам зняць шапкі, укленчыць перад здохлым абадраным падпёртым канём і пяяць перад ім сьвятыя хаўтурныя песьні, як быццам хаваючы запраўднага чалавека—нябожчыка. Жаўнеры горача пратэстуюць пропіў такіх зьдзекаў, але п. Вяленіч пагрозамі узброенай сілай даводзіць свае зьдзекі да канца.

Этэрарызованыя жаўнеры цішком расказвалі жыхарам вёскі аб гэтым здарэньні і нікаму ня заяўлялі, баючыся караў, але цяпер, як чутно ў вёсцы, нехта зрабіў заяву ўладам і справа перададзена ў вайсковы суд.

Янка Віхар.

М. Горадня.

Заарыштаваўшы вучыцеля і кіраўнікоў прытулка палякі хочуць забраць пад сваю апеку школу і прытулак. Ужо школе пакінулі польскага вучыцеля і робюць захады каб і прытулак зрабіць польскім. Сем'і арыштаваных знаходзюцца у крытычным становішчы — неадкладна патрэбна помач. Арышты і зьдзек над беларусамі вызываюць абурэньне сярод тутэйшага грамадзянства.

N.

М. Ашмяна.

З Ашмяны, як і з іншых мест Беларусі, рвецца крык крыўды. Сярод ашмянчукоў ня мала ёсьць верных сыноў сваей Бацькаўшчыны, якія адкрыта гардзіліся сваей нацыяй. Для здаволеньня духоўных патрэб, на запрацаваныя грошы, адчынілі тут беларускую кнігарню і бібліатэку, перайшоўшы перад гэтым сем кругоў уселякіх польскіх устаноў і фармальнасьцей. Але палякі аднэй рукой даюць, а другой аднімаюць. Тутэйшая чыноўніцкая дробезь пачала шкодзіць кнігарні усялякімі пагрозамі, даносамі, высяляць з памешканьня, дайшло да таго, што навет вывескі кралі. І вось на днях пачаліся арышты, пачалі нічтожыць ўсё беларускае Арыштавалі кнігара Я. Тарчэўскага, кнігарню зачынілі, а кніжкі забралі, пэўне з кніжкамі зробяць тое, што робяць і з нашымі газэтамі на поштах — спаляць. Вось цяпер нашыя ашмянчукі пазналі што знача „вольны з вольным“, пазналі, што каб быць вольным, дык мала мець кніжак і веры у абецанкі.

Тутэйшы.

М. Гарадзея Нясьвіскага пав.

На днях адбыўся рад чарговых вобыскаў у нашай вёсцы. Шукалі „бальшавікоў“. У Гарадзейскага каманданта паліцыі бальшавікамі называюцца беларусы. Дачуўшы хто чытае ці выпісаў беларускую газэту, ці хто мае кніжку беларускую гэты камандант налятае на вёску ноччу і пачынае сваеволіць. „Я вам, кажа, адаб'ю ахвоту чытаць беларускія газэты“. І праўду адбівае толькі не ахвоту, а здароўе. Так арыштаваўшы у в. Новая Вёска Зьмітрака Велянцея і К. Велянцея, абвінавачаных ў чытаньні беларускіх газэт, зьбілі іх да паўсьмерці. З. Велянцей пралежыў больш сутак не валадаўшы сабой.

Есьць яшчэ другая прычына, каб пакрыўдзіць беларуса, гэта шуканьне аружжа.

Усе хто ў нас ліхадзеіў, той і шукаў аружжа: немцы, бальшавікі, палякі, ізноў бальшавікі і палякі — якая ў каго была качарга, дык і тую адабралі. Аднак і цяпер усё шукаюць.— у вёсцы Дальня-Гарадзеяператрасьлі 12 хат і, разумеецца, нічога не нашлі.

У в. Падлесьсе Гарадзейскай гміны есьць каля 100 дзесяцін пашы, на якой пасьвілося адвякоў гаўядо вясковае і двароў п. п. Яноўскага і Маеўскай. Але вось п. Маеўская падала на суд жыхароў вёскі Падлесьсе і суд прысудзіў па 6000 м. штафу з кожнага селяніна за тое, што яны карысталіся пашай. — За што? Якім правам? крыўдуюць падлесяне, то-ж мы падатак за гэту зямлю заплацілі. Дзесяць скур з вала не дзяруць.

Але іхняй жальбы ніхто ня чуе.

Той жа самы Гарадзейскі камандант паліцыі загадаў каб людзі бралі пашпарты у гміне. І вось калі прыдуць да яго на подпісь, а ён зглецзіць, што у пашпарце напісана беларус, дык пачынае уселяк угражаць, а то й біць. Так абабіў ён Юзіка і Дзем'яна Пархімовічаў, якія уцяклі дамоў адрокшыся пашпартаў. Тут ўжо кажуць, што хай лепш штрафуюць чымся быць абабітым, а гэтага смаку рэдка хто у нашай гміне не пробаваў. І так гэта без канца. І што рабіць? „Ну проста хоць крыкні ратуй!“ І трэба крыкнуць на ўвесь сьвет аб гэтым зьдзеку, аб гэтай нечалавечай расправе над людзьмі, адно за тое, што яны іншай нацыянальнасьці. Роспач агортывае людзей. Сяляне топяць сваё гора у пазнанскай гарэлцы, залівающь вочы каб ня бачыць што робіцца дакола і што робюць з імі. І замест закрытых беларускіх школ адкрываюцца без перашкод рэстараны, корчмы.

Г. Слухач.

Вёска Незнанава, Валоўскай гм.

У нашай вёсцы на праваслаўных могілках стаяла каплічка. Але вось прышлі на пастой да нас польскія уланы, разабралі капліцу і збудавалі сабе лазьню.

Ц.

Вёска Круты-Берад, Нясьвіжскага п.

У нашай вёсцы ня так даўно адбыліся арышты і вобыскі. Былі арыштаваны Ганна Малойло, п. Шнаркевіч, і яшчэ адна старая кабеціна—удава, маці чацьвярох дзяцей. Праўда, пратрымалі іх нядоўга і выпусьцілі, але яны знайходзяцца пад наглядам паліцыі і мусяць мэльдавацца. Пры вобыску ў іх былі знойдзены беларускія школьныя падручнікі й больш нічога, але й за гэта, кажуць, ім добра дасталася.

І яшчэ здарылася ў нас такое. Прыяжджае да нашае вёскі п. Камандант Гародзейскае паліцыі, знайходзіць ў солтыса стары нумар „Крыніцы“ і за гэта так моцна зазлаваўся на солтыса, што пачаў яго старшэнна біць. Ад бойкі ў солтыса лопнула ў вушох перапонка й ён цяперака нічога ня чуе, бо аглох.

Вось як жывецца і няма каму пажаліцца, бо само-ж начальства зьдзекуецца.

Крутабярэзец.

Беніцкая гміна Ашмянскага пав.

Яшчэ 9-га сьнежня мінуўшага году у Беніцкай гміне, Ашмянскага пав., былі заарыштаваны польскай уладамі 15 чалавек жыхароў. Сярод іх тры мяйсцовыя беларускія вучыцялі, якія былі адарваны ад школьнай працы. Арыштаваных абвінавачвалі у пашырэньні сярод беларусаў нацыянальнай сьвядомасьці. Два з арыштаваных былі адпушчаны дамоў на 3-ці дзень посьле арышту. Шэсьць вышла на волю да суду пад грашавы заклад, адседзіўшы па месяцу на „Лукішках“ у вадзіночцы.

А рышта 7 няшчасных (сярод іх два вучыцялі: Янка Дудка і Аўгень Южык) дагэтуль пакутуюць у турме ня маючы грошаў залажыць за сябе залогу. Жудасна падумаць, як цяжка сядзець невінаватаму. На многае што яны спадзяваліся. Думалі пройдуць выбары ў Віленскі Сойм,—выпусьцяць.! Сабярэцца Сойм, зробяць „wcielenie“—тагды ўжо напэўне выпусьцяць, як польскіх грамадзян. — Узноў няма. Цяпер ужо спадзяюцца на вясну.,. А ну-ж ад соўнечнага цяпла ці не памягчэюць жорсткія сэрцы нашых ўлад?

Крыўда вось тое, што сядзяць ужо 3 месяцы, а яшчэ ня зроблена, навет абвінавачаньня. Аб гэтых людзех забыліся. Дзе так яшчэ ёсьць?

Пачакай.

Беларускае жыцьцё.

Вобыск у беларуса.

Ноччу з 13 на 14 лютага ў кватэры быўшага паручніка Беларускага войска п. А. Плескачэўскага, з'явілася двох незнаёмых у цывільнай вопратцы і паказалі загад аб арыштаваньні неякага М. Русака. Ня гледзячы на пратэсты п. Плескачэўскага, што ў яго памяшканьні такога няма, гэтыя паны ператрасьлі ўсю кватэру і выйшлі ні з чым.

Беларускі тэатр.

Белар. Музыкальна-Драмат. Гурток рыхтуецъ да пастаноўкі новую п'есу Ф. Аляхновіча ў 4-х актах „Шчасьлівы муж.“

Лекцыя аб Купале.

Расейскі літэратар п. Бохан у хуткім часе прачытае лекцыю ў Вільні па расейску аб Я. Купале і беларускай літэратуры.

(В. У.)

Лекцыя кс. А. Станкевіча.

У нядзелю а 6 г. ўвечара ў Беларускай гімназіі кс. А. Станкевіч прачытае лекцыю па тэму: „Жаночы рух і беларуская жанчына.“

Беларуская мова ў царкве.

Газэты паведамляюць, што патрыарх Ціхан выдаў распараджэньне, дазваляючы атпраўляць службу ў царкве ў беларускай мове ў межах этнаграфічнай Беларусі. Апрача таго пастанавіў пры зьмене япіскапаў назначаць ураджэнцаў Беларусі, якія-б ведалі беларускую мову.

Водгукі ўгодкаў латыскай прэсы

Уся латыская прэса адзначыла выступленьне беларусаў на юбілеі прэсы, пераказуючы зьмест прывітальнай тэлеграмы ад рэдакцыйнай калегіі „Беларускага Звону“ і прамовы рэдактара „Белар. Ведам.“ М. Гарэцкага.

А. М-скі.

Беларусы ў Коўні.

Пасада міністра беларускіх справаў да гэтага часу не замешчана. Літвіны жадалі-б бачыць на гэтай пасадзе п. Боева ці п. Корчынскага, але беларусы не згаджаюцца на гэтыя кандыдатуры й з свайго боку выстаўляюць п. І. Краскоўскага.

У Беларускай гімназіі.

— Вінікам працы вучняў. І Віл. Белар. Гімназіі па бібліатэчнай справе было ўрэшце адчыненьне пры гімназі, 18 лютага г. г. вучнёўскай бібліатэкі-чытальні. Ня гледзячы на дужа абмежаваную лічбу кніг выдаючыхся да чытаньня (з прычыны адсутнасьці вокладак), а таксама рожных нявыгад як то: адсутнасьць сталоў, шафаў і інш., чытачоў дужа многа. Кожная кніга мае дужа вялікае пашырэньне. Можна спадзявацца, што пачатая справа аб утварэньні гімназіяльнай бібліатэкі будзе хутка пытаньнем скончаным, калі ахвяры на бібліатэку будуць павялічвацца.

— Беларускія гімназісты мяркуюць паставіць у хуткім часе пераложаныя на беларускую мову вядомыя гогалеўскія рэчы „Рэвізор“ і „Жаніцьбу“, а дзеля гэтага ёсьць праэкт перарабіць гімназіяльную сцэну, каб зрабіць больш прыгодную для пастаноўкі сур'ёзных рэчаў.

— У хуткім часе мае выйсьці чародны № вучнёўскае часопісі „Маладое жыцьцё“. Шмат перашкаджае вучнёўскае працы благое матэр'яльнае становішча.

Падзяка.

Вучні І Віленскае Беларускае Гімназіі выказваюць свае шчырае „дзякуй“ паважанаму п. Знамяроўскаму за дармнае надрукаваньне афішаў на вечарыну 25 лютага г. г.

Вучні.

Апошнія весткі.

Забастоўкі.

— У Індзіі аб'яўлена агульная забастоўка, як пратэст за арышт індзійскага праўдадыра Гандзі.

— У Бурскай рэспубліцы агульная забастоўка рабочых давела да крывавых змаганьняў з уладай.

— У Магдэнбургу бастуець 25.000 рабочых.

Вайна ў Малай Азіі.

Паміж туркамі і грэкамі пачаліся баі, ў якіх перамогу бяруць туркі.

Туркі патрабуюць аддачы часьці Фракіі да ракі Марыць уключна і гор. Андрыанопаль.

Зносіны па чыгунцы між Польшчай і Расеяй.

Устаноўлены пастаянныя зносіны паміж Польшчай і Савецкай Расеяй па чыгунцы. Гранічная станцыя між Польшчай і Беларусяй ёсьць ст. Негарэлав а —Расеяй—Стоўбцы.

Курс на грошы.

18 сакавіка 1922 г.

Ням. маркі	1,640—16
Осты	1550—1510
Франц. франкі	380—376
Далляры	4275—4235
10 р. залат.	19900—19800
1 р. сераб.	1150—1075

Беларускі Паказальнік.

Беларускі Нацыянальны Камітэт — Вільня, Вострабрамская вул., 9.

Віленская Беларуская Гімназія (8 клясаў) —Вострабрамская вул., 9.

Цэнтральная Школьная Рада — Вільня Віленская вул., 12.

Беларускае Выдавецкае Таварыства — Вільня, Віленская вуліца, д. 33, кв, 1 (ад 4-5 гадзіны).

Віленскі Бел. Музык.—Драматыч. Гурток —Біскупская вул., д. № 12, кв. 6.

Беларуская кнігарня — Вільня, Завальная вул., 7.

Кааператыў «Райніца» — Вільня, Вялікая Пагулянка, 17.

„Беларускі Звон“ — Вільня, Біскупская вул., 12.

Беларускае Прэс - Бюро ў Рэвалі — Europa. Estonija. Rewal. Posi-Kast 153, Bielaruskaje Press-buro.

Рыскі аддзел Бел. Культ.— Прасьв. т-ва „Бацькаўшчына“ — Latwija, Riga, Nikolaja eela 20, dz. 1.

Белар. Аддзел пры Мініст. Прасьветы ў Латвіі — Latwija, Riga, Nikolaja eela 36 a.

Белар. Культ.- Прасьв. т-ва „Бацькаўўшчына“ ў Латгаліі — Дзьвінск, Віцебская вул., 16.

WeisDamhenisches Pressburo — Danzig, I, „srutm, 11.

Беларскі Студэнцкі Саюз — Біскупская вуліца № 12 кв. 6.

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацый прысылаць у гэты аддзел свае адрасы.

Рэдакта-выдавец Ф. АЛЯХНОВІЧ.
Друкарня „ДРУК“, Субач 2.